УДК 316.7:7.03(476)

*Н. А. Ліњкова*

# Увасабленне вобразаў і сюжэтаў нацыянальнай культурнай спадчыны ў сучасным выяўленчым мастацтве Беларусі

*Даследуецца праламленне вобразаў і сюжэтаў нацыянальнай культурнай спадчыны ў сучасным выяўленчым мастацтве Беларусі. Аналізуюцца творы вядомых беларускіх мастакоў У. Стэльмашонка, Я. Ждана, У. Савіча, Р. Сітніцы, А. Ксяндзова, В. Шаранговіча, Г. Паплаўскага, У. Басалыгі, М. Басалыгі, У. Васюка, у творчасці якіх увасоблена дадзеная тэматыка. Кампаратыўны аналіз жывапіснага і графічнага матэрыялу паказвае, што мастакі ў творах імкнуцца адлюстраваць праблемы самаідэнтыфікацыі ў сучаснай культурнай прасторы, дапамагаюць ствараць уяўленні аб каштоўнасцях і эстэтычных катэгорыях беларускага грамадства на працягу гісторыі яго існавання. Сучасныя творы выяўленчага мастацтва расказваюць гледачу пра нацыянальныя рэліквіі і гісторыю развіцця беларускай культуры ў асобах і падзеях.*

*Дадзеная з'ява ў айчынным выяўленчым мастацтве садзейнічае папулярызацыі дасягненняў нацыянальнай культуры і іх захаванню ў сучаснасці.*

***Ключавыя словы:*** *аб'екты архітэктурнай спадчыны, мастацкае адлюстраванне, выяўленчае мастацтва Беларусі, жывапіс, графіка, гістарычны партрэт, каляровая літаграфія, нацыянальная культурная спадчына, эстэтычныя каштоўнасці грамадства.*

*N. Linkova*

# The embodiment of images and plots of the national cultural heritage in the modern visual arts of Belarus

*The article examines the refraction of images and plots of the national cultural heritage in modern Belarusian fine art. The article analyzes the works of famous Belarusian artists V. Stelmashonok, J. Zhdan, U. Savich, R. Sitnitsky, A. Ksandzov, V. Sharangovich, G. Poplavsky, V. Basalygi, M. Basalygi, U. Vasyuk, whose work embodies this theme. A comparative analysis of pictorial and graphic material shows that the artists strive to reflect in their works the problems of self-identification in the modern cultural space, contributing to the formation of ideas about the values and aesthetic categories of Belarusian society throughout the history of its existence. Modern works of fine art tell the viewer about national shrines and the history of the development of Belarusian culture in faces and actions.*

*This phenomenon in domestic fine art contributes to the popularization of the achievements of national culture and their preservation in our days.*

***Keywords:*** *architectural heritage objects, artistic image, fine art of Belarus, painting, graphics, historical portrait, color lithography, national cultural heritage, aesthetic values of society.*

Сёння ў айчынным выяўленчым мастацтве назіраецца павышаная цікавасць да мастацкіх вобразаў, якія распавядаюць аб гісторыі развіцця беларускай культуры і захаванні самабытнай нацыянальнай культурнай спадчыны. Увагу сучасных беларускіх мастакоў прыцягваюць жыццё і дзейнасць беларускіх асветнікаў і гістарычных дзеячаў, беларускі фальклор і народны касцюм, традыцыйнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і рамёствы, нацыянальныя рэліквіі і інш.

Гэта з’ява ў беларускім мастацтве стала наглядным выразнікам тых працэсаў, якія адбываліся ў грамадскім і эканамічным жыцці нашай краіны з пачатку 1990-х гг. Дадзены перыяд характарызуецца сур’ёзнай пераацэнкай эстэтычных каштоўнасцей, што вельмі паўплывала на далейшае развіццё беларускага мастацтва. Трэба адзначыць, што патэнцыял духоўных каштоўнасцей беларусаў на працягу стагоддзяў пераадольваў разнастайныя бар’еры і ў наш час уваходзіць у свядомасць грамадства праз мастацкія сродкі.

Пры даследаванні дадзенай тэмы мы абапіраліся на тэарэтычныя распрацоўкі айчынных аўтараў па гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі і навукова-папулярныя выданні, прысвечаныя творчасці беларускіх мастакоў [1–4; 6–8]. Тэарэтычныя і гістарычныя аспекты развіцця партрэтнага жывапісу Беларусі, у тым ліку гістарычнага партрэта, разглядаюцца А. В. Мядзвецкім [6]. Гістарычны аспект развіцця беларускай кніжнай графікі ў XX ст. раскрывае М. Р. Баразна [2]. Персаналіі дзеячаў сучаснага выяўленчага мастацтва Беларусі прадстаўлены ў калектыўнай працы выкладчыкаў кафедры гісторыі і тэорыі мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў [8], а таксама ў серыях навукова-папулярных выданняў: «Славутыя мастакі з Беларусі» [9] (заснавана ў 2012 г. Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь)[1], «Майстры выяўленчага мастацтва стран СНГ» (заснавана грамадскім аб’яднаннем «Беларускі саюз мастакоў») [3].

*Мэта артыкула* – выяўленне асаблівасцей мастацкага ўвасаблення вобразаў і сюжэтаў нацыянальнай культурнай спадчыны ў творчасці сучасных прадстаўнікоў выяўленчага мастацтва Беларусі.

У наш час растуць эстэтычныя запыты грамадства, якое імкнецца да пазнання беларускай гісторыі і нацыянальнай культуры. Дадзеная з’ява ў мастацтве найбольш ярка выявілася ў партрэтным жывапісе і прадстаўлена імёнамі дзеячаў культуры, навукі, дзяржаўных і грамадскіх структур, якія ўнеслі вялікі ўклад у фарміраванне і развіццё культурнага асяроддзя на тэрыторыі Беларусі.

Важнае месца ў творчасці айчынных мастакоў у 1990–2000-я гг. займалі вобразы асветнікаў, паэтаў, мастакоў і гістарычных дзеячаў:

[1] Аўтарам і каардынатарам праекта «Славутыя мастакі з Беларусі» з’яўляецца заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кандыдат мастацтвазнаўства У. І. Пракапцоў.

Францыска Скарыны, Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Сімяона Полацкага, Усяслава Чарадзея, Вітаўта, Альгерда, Кастуся Каліноўскага, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Язэпа Драздовіча, Івана Хруцкага і інш.

Найбольш яскрава гэтая тэндэнцыя знайшла адлюстраванне ў звароце да выявы беларускага асветніка і першадрукара Францыска Скарыны. «Жывапісная Скарыніяна», пачатак якой паклалі ў 1920-я гг. працы Я. Кругера і Я. Драздовіча, атрымала далейшае развіццё ў канцы 1950-х гг. у творах А. Кроля, В. Кухарава і І. Ахрэмчыка [1, с. 230]. У 1960–1980-я гг. над гэтай тэмай працавалі П. Сергіевіч, У. Стэльмашонак, Л. Шчамялёў і інш. У 1990-я гг. да выявы першадрукара ў сваёй творчасці звярнуліся В. Губараў «Вяртанне» (1991), Г. Вашчанка «Нашчадкам» (1990–1995).

Нельга абмінуць у дадзеным напрамку творчую дзейнасць народнага мастака Беларусі У. Стэльмашонка. У 2001 г. для цэнтра імя Ф. Скарыны майстар напісаў серыю графічных партрэтаў дзеячаў Інбелькульта (4 аркушы з 16 партрэтамі дзеячаў Інстытута беларускай культуры, рэпрэсіраваных у 1920–1930-я гг. і рэабілітаваных пасмяротна) [5, с. 166]. Кожны твор ствараўся на аснове архіўных матэрыялаў і вывучэння творчых біяграфій. Трэба адзначыць, што сярод шэрагу гістарычных партрэтаў асобнае места займаюць серыі работ, прысвечаныя паэту А. Міцкевічу – «Музы Міцкевіча» і «Крыж Міцкевіча» (канец 1990 – пачатак 2000-х гг.), знакамітаму магнацкаму роду Радзівілаў (серыя з 26 партрэтаў), таксама партрэты народнага артыста БССР і СССР Р. Шырмы і паэта М. Багдановіча.

Беларускі жывапісец А. Ксяндзоў у трыпціху «Захавальніцы Беларусі» (2006), выкананым у стылі сармацкіх партрэтаў, падкрэслівае ролю жанчыны ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі XII–XVI стст. Кампазіцыя ўвасабляе тры ідэйныя матывы: жанчына-маці, жанчына-воін, жанчына-дзяржаўны дзеяч. Цэнтральную частку кампазіцыі займае зборны вобраз, прататыпам якога з'яўляецца канкрэтная гістарычная асоба – княжна Анастасія Слуцкая, якая знаходзіцца ў акружэнні знатных воінаў у парадных даспехах. У левай частцы кампазіцыі велічна паўстае вобраз жанчыны-маці, якая ўвасабляе працяг роду і сувязь пакаленняў. Правая частка трыпціха прадстаўлена вобразам Сафіі Слуцкай, кіраўніка і асветніцы XVI ст., якая адлюстравана ў параднай вопратцы са скіпетрам улады ў руцэ [Там жа, с. 167]. Фонам з'яўляюцца Слуцкая брама Нясвіжа і Фарны касцёл [6, с. 240].

Да культурных вытокаў народа неаднаразова звяртаецца ў творах вядомы беларускі жывапісец і графік, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь (1990) У. Савіч. Яго творчасці ўласціва стварэнне эфекту зрушэння часу: на палотнах дзеячы беларускай культуры і гісторыі мінулых стагоддзяў паўстаюць перад гледачамі як сучаснікі.

У пачатку 2000-х гг. на карцінах майстра з'явіліся такія гістарычныя дзеячы, як Вітаўт, Міндоўг, Усяслаў Чарадзей, Барбара Радзівіл і інш. Асяроддзе вакол знакамітай асобы з мінулага фарміруе сукупны вобраз усёй карціны, надае пэўны сэнс. У. Савіч выпрацаваў асаблівую вобразную мову, абапіраючыся на традыцыі і акадэмізм. Партрэты мастака вельмі падобныя на іконы. У сфарміраваным вобразным ладзе У. Савіча выразна выказана сучаснае разуменне ўладкаванасці еўрапейскай культуры, заснаванай на хрысціянскай парадыгме [3, с. 19].

Партрэтны трыпціх народнага мастака Беларусі Г. Паплаўскага «Слаўны горад Полацк» (2008) уключае партрэтныя выявы выбітных беларускіх асветнікаў, ураджэнцаў старажытнага Полацка: Сімяона Полацкага, Ефрасінні Полацкай і Францыска Скарыны. Лейтматывам усіх трох кампазіцый выступае кніга. Вобраз Ефрасінні ўспрымаецца як абраз, што ажыў. У вобразе Сімяона Полацкага акцэнтуецца яго гістарычная роля – грамадскага дзеяча і асветніка. У паясным партрэце Францыска Скарыны, які трымае ў руках адкрытую кнігу, лёгка ўзгадваецца думка пра яе ролю ў чалавечым жыцці.

У 1991–1992 гг. мастаком Р. Сітніцай быў створаны цыкл карцін «Нясвіж – водгулле былых часоў» [7, с. 7]. Дадзены цыкл складаецца з трох частак: «Прывіды старога парку» (1991), што ўяўляе сабою партрэты княжацкага роду Радзівілаў, якія арганічна ўпісаны ў прастору парку старажытнага горада; «Брама ў мінулае» (1992) і «Водгулле былых часоў» (1992), якія распавядаюць у адзінай форме пра знакаміты род і аб'екты архітэктурнай спадчыны старажытнага Нясвіжа. Пры гэтым Р. Сітніца паказвае плынь зафіксаваных у часе і прасторы падзей і іх узаемасувязь [Там жа].

Мастак Я. Ждан – заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат першай прэміі «За духоўнае адраджэнне» (1998) за цыкл абразоў «Беларускія праваслаўныя святыя». Мастак напісаў шэраг твораў-прысвячэнняў асветнікам і святым, сярод якіх Францыск Скарына (1990), Св. Ефрасіння Полацкая (1991), Св. Лаўрэнцій Тураўскі (1991), Св. Соф'я Слуцкая (1991), Св. Макарый Пінскі (1992), Рагнеда (1994), Князь Чарадзей Полацкі (1994) і інш. [4, с. 16]. Падчас працы над выявамі беларускіх асветнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва мінулых стагоддзяў (М. Гусоўскі, С. Будны, А. Міцкевіч, С. Манюшка, М. Багдановіч, Я. Купала, Я. Колас і інш.) Я. Ждан напачатку вывучаў гісторыю развіцця беларускай культуры.

Прадстаўленая партрэтная галерэя лепшых прадстаўнікоў беларускай культуры, пераносячы нас у мінулае, спрыяе далейшаму развіццю культуры і духоўнасці нашай краіны. Акрамя выяў выбітных дзеячаў беларускай культуры вялікае ўздзеянне на сучаснага гледача аказвае актыўнае вырашэнне асяроддзя вакол знакамітай асобы, якое насычаецца гістарычнымі артэфактамі. Такім чынам, беларускія мастакі-

жывапісцы імкнуцца да глыбокага разумення мінулага і яго значэння для сучаснасці.

Мастакі тыражнай і арыгінальнай графікі таксама яскрава адлюстроўваюць у творах вобразы і сюжэты нацыянальнай спадчыны і гісторыі развіцця культуры Беларусі, але, у параўнанні з жывапісам, у графіцы дадзеная тэматыка прадстаўлена не так шырока.

Найбольш важным этапам станаўлення графічнага мастацтва Беларусі сталі 1970-я гг. – этап стабілізацыі тэндэнцый і ўдасканалення графічнага майстэрства.

У апошняй чвэрці XX ст. пачынаецца сучасны этап развіцця айчыннай графікі: адбываецца фарміраванне адметных пластычных кірункаў, традыцыйных асаблівасцей, метадаў і г. д. Менавіта ў гэты перыяд складаецца паняцце «беларуская школа кніжнай графікі». Гэты тэрмін выкарыстоўвалі ў артыкулах такія даследчыкі беларускага мастацтва, як В. Ф. Шматаў, Я. Ф. Шунейка, М. А. Гугнін, А. І. Атраховіч [2, с. 8]. Прыкладам развіцця традыцый увасаблення нацыянальнай тэматыкі ў беларускім графічным мастацтве могуць служыць ілюстрацыі да беларускіх народных казак В. Славука, М. Селяшчука, афармленне літаратурнай класікі В. Шаранговічам, Г. Паплаўскім і іншымі мастакамі. Кніжная графіка Беларусі ў XX ст. з'яўляецца прадуктам сінтэзу літаратуры, выяўленчага мастацтва і дызайну.

Стваральнік сучаснай школы беларускай графікі заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1978), народны мастак Беларусі (1991) В. Шаранговіч з'яўляецца аўтарам ілюстрацый да больш за 70 выданняў твораў беларускіх класікаў, сучасных паэтаў і пісьменнікаў у тэхніцы лінагравюры, літаграфіі, акварэлі. Графічныя творы і плакат у той час набывалі вялікую папулярнасць.

В. Шаранговіч у лінагравюрах, аўталітаграфіях, акварэлях і манатыпіях здолеў гарманічна спалучыць класічную традыцыю з сучаснымі метадамі формаўтварэння ў кампазіцыі. Цэнтральным вобразам у творчасці майстра вельмі часта з'яўлялася гістарычная асоба. В. Шаранговіч адлюстраваў перыяд ваеннага і пасляваеннага жыцця сучаснікаў і перыяд адраджэння цікавасці да нацыянальнай гісторыі і культуры. Сярод твораў станковай графікі В. Шаранговіча нельга абмінуць лінагравюры «Партрэт Ф. Скарыны» (1971), «Якуб Колас у Люсінскай школе» (1972), аўталітаграфію «Ганчар» (1973), якія пранізаны нацыянальнай тэматыкай. Сярод асноўных прац мастака, створаных на мяжы XX–XXI стст., адзначым творы кніжнай графікі: мастацкае афармленне выдання паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш» (Мінск: Беларускі фонд культуры, 1998) – пераплёт, тытульны ліст, франтыспіс, шмуцтытулы – 3, ілюстрацыі – 36. Акварэль; мастацкае афармленне 2 выданняў паэмы Я. Коласа «Новая зямля» выдавецтваў

«Беларускі фонд культуры» (2002) і «Мастацкая літаратура» (2014) – для кожнага з выданняў створаны вокладкі, франтыспісы, шмуцтытулы і па 90 акварэльных ілюстрацый. Характэрнай з’явай творчасці мастака з’яўляецца тое, што да афармлення літаратурнай класікі Я. Коласа, Я. Купалы, А. Міцкевіча, У. Караткевіча, Р. Барадуліна і інш. майстар звяртаўся неаднаразова і ў папярэдні савецкі перыяд. Унёсак народнага мастака Беларусі В. Шаранговіча ў беларускую графіку другой паловы XX ст. заслугоўвае вялікай павагі.

Вельмі выразна дадзеную тэму ў нацыянальным каларыце раскрывае вядомы беларускі графік У. Басалыга. Галоўнай задачай творчасці мастака з’яўляецца адлюстраванне развіцця нацыянальнай культуры беларусаў. Найбольш яркім прыкладам сярод твораў майстра з’яўляецца серыя каляровай літаграфіі «Помнікі дойлідства Беларусі» (1977–1984), якая складаецца з двух дзясяткаў графічных аркушаў: «Касцёл у Ішкальдзі» (1977), «Царква ў Малым Мажэйкаве» (1977), «Мірскі замак» (1977), «Камянецкая вежа» (1983), «Каложская царква ў Гродне» (1983), «Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку» (1983), «Нясвіжскі замак» (1983, 1986) і інш.

Цыкл «Помнікі дойлідства Беларусі» спалучае рысы прафесійнага і традыцыйнага народнага мастацтва. Кожная графічная кампазіцыя майстра з’яўляецца своеасаблівым «партрэтам» аб’екта архітэктурнай спадчыны Беларусі. Па аўтарскай задуме помнікі архітэктуры вылучаюцца дэкаратыўнай рамкай. Паміж знешняй рамкай ліста і ўнутранай, што атачае аб’ект, мастак змяшчае стужкі, ручнікі, разнастайныя кветкі, лісце, букеты, якія сімвалізуюць яго захопленасць прыгажосцю і веліччу архітэктуры, талентам архітэктараў і будаўнікоў [9, с. 17]. Статыку выяў архітэктурных збудаванняў мастак дапаўняе дынамікай падачы навакольнага асяроддзя. Дадзеную тэму У. Басалыга актыўна развівае і ў наступныя дзесяцігоддзі.

Яшчэ адзін прадстаўнік дадзенай дынастыі – М. Басалыга, працуючы ў тэхніцы лінагравюры, выканаў у нацыянальнай тэматыцы серыі твораў паводле паэмы Я. Купалы «Курган» (1980) і афортаў па матывах твораў паэта (1982), каляровыя літаграфіі: «Айчыну сваю баронячы», «Бітва з татарамі» (1988–1989), трыпціх «Грунвальдская бітва» (1989); «Бітва пад Оршай» (1989); стварыў партрэты герояў беларускага мінулага: «Давыд Гарадзенскі», «Рагнеда», «Канстанцін Астрожскі», «Леў Сапега» і інш. [8, с. 39]. Адзначым, што гістарычнай праўдападобнасці ў выяўленні падзей, перадачы характару эпохі, касцюмаў персанажаў і іншых атрыбутаў спрыяла ўважлівае вывучэнне мастаком разнастайных крыніц па айчыннай гісторыі.

Вядомы беларускі графік У. Васюк з’яўляецца аўтарам серыі плакатаў «Асветнікі Беларусі» («Ефрасіння Полацкая», «Сымон Будны», «Францыск Скарына», «Мікола Гусоўскі», 1980–1990), «Гістарычныя пер-

соны Беларусі», «Творцы»; серыі графічных кампазіцый «Прывіды маёй маленькай Радзімы» (1986–2007) і інш. У. Васюк – аўтар геральдычных распрацовак (партрэтны знак першага рэктара БДУ В. І. Пічэты (2003); знак беларускага фонду культуры («Руплівец. Стваральнік» (2017) і інш.) [Там жа, с. 59].

Асэнсаванне жывапіснага і графічнага матэрыялу, што ствараецца ў апошні час і распавядае ў візуальнай форме пра нацыянальныя рэліквіі і гісторыю развіцця беларускай культуры ў асобах, з'явах і падзеях, патрабуе пэўнага досведу. Мастакі сваімі творамі спрабуюць паказаць праблемы культурнай самаідэнтыфікацыі Беларусі ў сучаснай культурнай прасторы, дапамагаюць фарміраваць уяўленні аб каштоўнасцях і эстэтычных катэгорыях беларускага грамадства на працягу гісторыі яго існавання.

Такім чынам, адлюстраванне і аднаўленне нацыянальных асаблівасцей культуры, справа вяртання нацыянальнай культурнай спадчыны стала асновай для развіцця сучаснага мастацтва Беларусі. Зварот да даследавання культурнай самабытнасці беларускага мастацтва, на наш погляд, вызначаецца функцыянаваннем айчыннай мастацкай культуры ва ўмовах інтэнсіўных працэсаў глабалізацыі, якая характарызуецца тэндэнцыямі культурнага ўзбагачэння, але ў той жа час патрабуе захавання нацыянальнай ідэнтычнасці, пазбягання працэсаў асіміляцыі.

Варта адзначыць, што істотным момантам у вырашэнні заяўленай тэмы стала замяшчэнне стэрэатыпаў, якія сфарміраваліся ў савецкі час, і зварот да тых праблем і пытанняў, якія заставаліся па-за межамі ўвагі творцаў па розных сацыяльных прычынах. Праява аналагічных тэндэнцый характэрна не толькі для жывапісу і графікі, але і для ўсёй жанравай разнастайнасці беларускага выяўленчага мастацтва.

Гісторыя айчыннай кніжнай і станковай графікі, партрэтнага, гістарычнага і міфалагічнага жывапісу і іншых відаў і жанраў выяўленчага мастацтва Беларусі, багатых на высокамастацкія творы, прысвечаныя нацыянальнай культурнай спадчыне, патрабуе далейшага ўсебаковага навуковага даследавання айчыннымі мастацтвазнаўцамі.

1. *Баразна, М. Р.* Гісторыя выяўленчага мастацтва Беларусі XX стагоддзя : вучэб. дапам. / М. Р. Баразна. – Мінск : БДАМ, 2016. – 320 с.

2. *Баразна, М. Р.* Мастацтва кнігі Беларусі XX стагоддзя / М. Р. Баразна. – Мінск : Беларусь, 2007. – 239 с. : каляр. іл.

3. Владимир Савич [Изоматериал] : альбом / ред. А. А. Руб. – М. : Галарт, 2013. – 215 с. – (Мастера изобразительного искусства стран СНГ, Белорусский союз художников).

4. Евгений Ждан. Жизнь в искусстве [Изоматериал] : альбом / сост. Е. И. Ждан ; вступ. ст. П. М. Сапотько. – Несвиж : Несвиж. тип. им. С. Будного, 2014. – 178 с.

5. *Линькова, Н. А.* Визуализация образов истории белорусской культуры в портретной живописи Беларуси (1990–2000 годы) / Н. А. Линькова // Материалы международного научного форума «Образование. Наука. Культура», 20 нояб. 2019 г. : в 5 ч. Ч. 1 : Пленарное заседание. Междунар. науч.-практ. конф. «Традиции и новации в изо-

бразительном, декоративно-прикладном искусстве и дизайне» : сб. науч. ст. / отв. ред. Н. В. Осипова. – Гжель, 2020. – С. 166–168. – URL: art-gzhel.ru/download/onk2019-1.pdf (дата обращения: 12.10.2024).

*6. Медвецкий, А. В.* Портретная живопись Беларуси : моногр. / А. В. Медвецкий, С. В. Медвецкий. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2017. – 336 с.

*7.* Рыгор Сітніца. Простыя рэчы [Выяўленчы матэрыял] : фотаальбом / уклад. і аўтар тэксту Р. Сітніца ; пер. на англ. мову Дар'і Бунеевай [і інш.]. – Мінск : Звязда, 2017. – 232 с. : іл.

*8.* Современное искусство Республики Беларусь : справочник персоналий / сост. В. П. Прокопцова [и др.] ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2018. – 452 с.

*9.* Уладзімір Басалыга [Выяўленчы матэрыял] / аўтар тэксту і склад. В. У. Вайцэхоўская. – Мінск : Беларусь, 2022. – 95 с. – (Славутыя мастакі з Беларусі).

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 21.11.2024.